Сяргей НОВІКАЎ

# Баявыя дзеянні Чырвонай арміі летам 1941 года: дасягненні і перспектывы найноўшай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства

*Сёлета спаўняецца 75 год з пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Аднак многія пытанні адносна падзей таго часу пакуль так і не знайшлі свайго адлюстравання альбо патрабуюць пераасэнсавання на аснове выяўленых крыніц. Таксама пажадана стварэнне абагульненай карціны падзей гісторыкамі розных краін.*

Гісторыка-дакументальнае двухтомнае выданне "**1941 год. Страна в огне**"[1], якое выйшла ў 2011 г. і з'явілася вынікам беларуска-расійска-ўкраінскага акадэмічнага супрацоўніцтва, пакуль не атрымала істотнай увагі ў айчыннай ваенна-гістарычнай навуцы. Між тым, яно з'яўляецца паказальным, паколькі выходзіць з узроўня нацыянальных гістарыяграфій на спробу сумеснага асэнсавання ваеннай гісторыі. Таму звернемся да яго больш падрабязна, каб вызначыць моцныя бакі і праблемныя месцы.

У якасці прадмету аналізу пакуль возьмем толькі адзін аспект — адлюстраванне баявых дзеянняў паміж Чырвонай арміяй і германскім вермахтам на тэрыторыі Беларусі, Расіі і Украіны летам 1941 г. Прычым асаблівую ўвагу звернем на тое, ці прадстаўлены погляд з абодвух бакоў на падставе розных крыніц. Зыходзячы з гэтага, паставім перад сабой наступныя задачы: 1) прааналізаваць метадалагічныя падыходы напісання гісторыка-дакументальных нарысаў; 2) выявіць характар уведзеных беларускімі, расійскімі і ўкраінскімі гісторыкамі дакументальных крыніц; 3) акрэсліць перспектывы развіцця беларускай ваенна-гістарычнай навукі.

### I. Метадалагічныя падыходы гісторыка-дакументальных нарысаў

Першая кніга выдання "1941 год. Страна в огне" называецца "**Очерки**" і ўключае разгляд падзей 1941 г. вядомымі гісторыкамі Расіі, Беларусі і Украіны. Пачынаецца яна зваротам да чытача кіраўнікоў акадэмічных інстытутаў гісторыі — А.Кавалені (Беларусь), В.Смолія (Украіна) і А.Чубар'яна (Расія), дзе адзначана, што ў 1990—2000-я гг. на прасторах СНД *"узніклі і развіваюцца нацыянальныя школы гісторыкаў са сваімі поглядамі і ацэнкамі"*[2]. Зыходзячы з гэтага, міжнародны калектыў вылучыў мэтай сумеснай працы аднавіць на навуковай аснове карціну подзвігу народа, каб зрабіць яшчэ адзін крок у вывучэнні пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны (с. 5).



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***

*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004), "Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў" (Мн., 2015, 2-е выд.), больш за 300 навуковых публікацый. З'яўляецца сурэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—14, Мн., 2002—2016).*




Кніга складаецца з трох частак, якія маюць назвы "Расія", "Беларусь", "Украіна". Нарысы ў кожнай з іх напісаныя гісторыкамі адпаведнай краіны.

У **першай частцы — "Расія"** (с. 7—240) — разгледжаны міжнароднае становішча Савецкага Саюза і асноўныя вектары яго знешняй палітыкі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны (А.Ржэшэўскі), падрыхтоўка Германіі і яе саюзнікаў да нападу на СССР (Я.Кулькоў), савецкія планы адбіцця агрэсіі і незавершанасць падрыхтоўкі краіны да абароны (А.Ржэшэўскі). Гэтыя матэрыялы складаюць першы раздзел нарысаў, які называецца ***"Перад вялікім выпрабаваннем"*** (с. 10—77). У другім раздзеле ***"Наступленне агрэсараў і разбурэнне бліцкрыгу"*** (с. 78—192) расійскімі даследчыкамі прапанаваныя толькі два матэрыялы: "На грані катастрофы. 22 чэрвеня — верасень 1941 года" (М.Мягкоў) і "Першая вырашальная бітва: ад абароны Масквы да агульнага контрнаступлення Чырвонай арміі" (М.Мягкоў). Завяршае першую частку трэці раздзел ***"Усе сілы — на разгром ворага"***, куды ўвайшлі матэрыялы "Перабудова эканомікі і мабілізацыі рэсурсаў краіны для барацьбы з ворагам" (Я.Кулькоў), "Народ і вайна" (А.Ржэшэўскі).

У цэнтры нашай увагі — **нарыс М.Мягкова аб падзеях 22 чэрвеня — верасня 1941 г.** Даследчык пачынае разгляд з агульнай характарыстыкі сіл Германіі і яе саюзнікаў. Пры гэтым, аднак, ён не дае звестак адносна сілаў СССР і не паказвае суадносіны сілаў двух бакоў. Прыводзіцца толькі вядомая з савецкай гістарыяграфіі традыцыйная выснова аб значнай перавазе сіл агрэсара на рашаючых напрамках наступлення (с. 78). Са свайго боку заўважым, што ў расійскім даведачным выданні "Вялікая Айчынная без грыфу сакрэтнасці" (2010), падрыхтаваным на аснове раней закрытых архіўных дакументаў, канстатуецца, што сумарныя суадносіны сіл і сродкаў Германіі і яе саюзнікаў і СССР складалі 1,19 да 1, а вось сухапутных войскаў — 1 да 1,12 адпаведна[3]. Ды і сам М.Мягкоў у адным з ранейшых выданняў прытрымліваўся думкі, што па агульнай колькасці танкаў і самалётаў перавага была на савецкім баку[4]. Здзіўляе і факт выкарыстання фактычна ў якасці адзінай замежнай гістарыяграфічнай крыніцы працы амерыканскага ваеннага даследчыка Д.Гланца. Пры ўсёй павазе да гэтага гісторыка, які актыўна выкарыстоўваў і савецкія, і нямецкія крыніцы (не высвятляючы, аднак, ступень іх навуковай верагоднасці), адзначым, што пры вывучэнні падзей на германа-савецкім фронце перавагу ў даследаванні неабходна надаваць нямецкаму 10-томнаму выданню "Германскі рэйх і Другая сусветная вайна", падрыхтаванаму Цэнтрам ваенна-гістарычных даследаванняў у Германіі[5]. Аднак аўтар яго не выкарыстоўваў, што асабліва заўважна ў некаторых дэталях. Так, апісваючы сілы трох нямецкіх груп, што наносілі ўдар па заходніх рубяжах СССР, ён піша, што *"танкавая дывізія ў 1941 г. па штаце складалася з двух-трох танкавых батальёнаў"* (с. 79). (Заўважым, што спасылка пры гэтым зроблена на Д.Гланца.) На самай жа справе размова тут павінна ісці пра танкавыя палкі, асновай якіх у сваю чаргу з'яўляліся танкавыя батальёны[6].

Аналізуючы аператыўныя планы вермахта, аўтар прыходзіць да слушнай высновы, што гітлераўскія войскі мелі на мэце знішчыць асноўныя сілы Чырвонай арміі ўжо ў прыгранічных раёнах. Характарызуючы далей пяць савецкіх прыгранічных акруг, у тым ліку Заходнюю Асобую, даследчык выказвае думку аб тым, што большасць савецкіх танкавых і механізаваных дывізій, аб'яднаных у складзе 20 механізаваных карпусоў, былі баяздольныя толькі на паперы (с. 81). Аднак гэты тэзіс не пацверджаны дакументальна. Больш за тое, контрудары, нанесеныя ў першыя дні вайны механізаванымі карпусамі ў Беларусі (раёны Гродна, Лепеля, Жлобіна і Рагачова) і Украіне (у раёне Роўна, Луцка, Брадоў, Дубна), фактычна абвяргаюць прыведзенае меркаванне[7].

Далей у матэрыяле расійскага гісторыка адзначаецца, што, нягледзячы на значны колькасны склад, савецкія войскі *"маральна і інстытуцыянальна не былі падрыхтаваны да той вайны, якую збіраўся весці Гітлер"* (с. 81). Чырвоная армія знаходзілася на этапе гіганцкай рэарганізацыі. М.Мягкоў лічыць, што *"напярэдадні вайны ні вярхоўным кіраўніцтвам, ні на ўзроўні ваенных акруг не было дадзена правільнага адказу на важнейшае пытанне, якім будзе характар будучай вайны"*. Цалкам пагаджаючыся з такой ацэнкай, хацелася б заўважыць, што пры разглядзе прычын катастрафічнага развіцця сітуацыі на Заходнім фронце ў першыя дні вайны аўтару неабходна было б узгадаць, што аб характары будучай вайны Германіі супраць СССР і напрамку галоўнага ўдару ў перадваенны час ясна выказаўся маршал М.Тухачэўскі. Яшчэ ў 1937 г. у ходзе судовага працэсу Спецыяльнай судовай прысутнасці Вярхоўнага суда СССР ён выклаў свае думкі ў "Плане паражэння", дзе вызначыў галоўную стратэгічную прастору будучага ўдару

войскаў Германіі вышэй за Прыпяцкія балоты, г. зн. на тэрыторыі Заходняй Асобай ваеннай акругі[8]. М.Мягкоў толькі часткова закранае гэты аспект, канстатуючы факт недаацэнкі падобных папярэджанняў у Генштабе і наркамаце абароны СССР.

Фрагментарна разглядаючы ваенныя падзеі ў паласе абароны Заходняй Асобай ваеннай акругі, аўтар прыходзіць да высновы, што на гэтым напрамку прыгранічных баёў летам 1941 г. склалася асабліва цяжкае становішча. Акружэнне асноўных сіл Заходняга фронту стала адной з першых найбуйнейшых трагедый, якая прывяла да *"гібелі ці ўзяцця ў палон больш за 300 тыс. чалавек з групоўкі генерала арміі Паўлава"* (с. 83). Такая ж лічба прыведзена ў найноўшым даведачным выданні "Вялікая Айчынная без грыфу сакрэтнасці"[9]. Пры гэтым адкрытым застаецца пытанне аб ваеннапалонных, якое ў апошні час стала адной з ключавых праблем даследавання вынікаў баявых дзеянняў летам 1941 г. Беларускія гісторыкі на аснове ўвядзення ў навуковы зварот нямецкіх дакументальных крыніц ужо паказалі сапраўдныя маштабы той трагедыі — на тэрыторыі Беларусі за гады вайны загінуў кожны трэці чырвонаармеец, які быў узяты ў палон войскамі групы армій "Цэнтр", і кожны пяты з усіх савецкіх ваеннапалонных. Паводле нямецкіх дакументаў, да канца жніўня 1941 г. на цэнтральным напрамку наступлення вермахта былі ўзяты ў палон 784 тыс. чырвонаармейцаў[10].

Аналізуючы вынікі абарончых баёў Чырвонай арміі ў Беларусі, М.Мягкоў называе памылковым адзін з першых контрудараў, нанесены на другі дзень вайны ў напрамку Гродна (с. 93). Пры гэтым аўтар падтрымлівае меркаванне камандуючага 3-й арміяй генерал-лейтэнанта У.Кузняцова, выказанае пазней ва ўспамінах, што больш правільным у той сітуацыі было б рашэнне камандавання Заходняй Асобай ваеннай акругі аб аператыўным удары адыходзячых часцей Чырвонай арміі па тылах 2-й танкавай групы Г.Гудэрыяна, якая хутка прасоўвалася на Баранавічы. Гэтую задачу павінна была выканаць 4-я армія генерала А.Карабкова. Аднак аб баяздольнасці гэтай арміі сведчыць аператыўная зводка штаба арміі ад 24 чэрвеня 1941 г., якую расійскі аўтар прыводзіць у сваім матэрыяле. Паводле дакумента, *"...усе часці, за выключэннем 55-й і 75-й стралковых дывізій, не баяздольны і патрабуюць тэрміновага даўкамплектавання асабовым складам і матэрыяльнай часткай і прывядзення ў парадак..."* (с. 90).

Завяршаючы разгляд баявых падзей на тэрыторыі Заходняй Асобай ваеннай акругі, аўтар акцэнтаваў увагу на адной з галоўных бітваў, якой надае вырашальнае значэнне ў ходзе зрыву нямецкага бліцкрыгу. Гэта Смаленская бітва, якая ў ліпені — верасні 1941 г. адбывалася на галоўным напрамку наступлення вермахта. Пры гэтым аўтар адзначае, што насамрэч тэатр баявых дзеянняў быў больш шырокім і пакрываў вялікую прастору, у тым ліку Беларусі. Аднак характар і маштабы баёў на беларускай тэрыторыі ў матэрыяле паказаны толькі схематычна. А менавіта яны, на нашу думку, сталі галоўнай прычынай таго, што група армій "Цэнтр" была вымушана перайсці да абароны і адкласці на цэлых два месяцы наступленне на маскоўскім напрамку. На наш погляд, у ходзе контрнаступлення Заходняга і Цэнтральнага франтоў у канцы ліпеня — пачатку жніўня 1941 г. вызначыліся два ачагі барацьбы: адзін — у раёне Смаленска і Ельні, другі — на рацэ Сож і ў міжрэччы Дняпра і Бярэзіны. Як вынікае з "Меркаванняў і распараджэнняў фюрэра" ад 28 ліпеня 1941 г., *"важнейшай задачай з'яўляецца ліквідацыя пагрозы на флангзе групы армій "Цэнтр" шляхам разгрому варожай групоўкі, якая знаходзіцца ў раёне Гомеля і на поўнач ад яго"*[11]. Такім чынам, сілы Заходняга і Цэнтральнага франтоў, якія абаранялі бярэзінска-дняпроўска-сожскія рубяжы, пры гэтым паспяхова контратакуючы праціўніка на бабруйскім напрамку, пераўтварылі з сярэдзіны ліпеня Гомель і міжрэчча Дняпра і Бярэзіны ў "ключавую праблему" для вермахта на маскоўскім напрамку. Гэта галоўным чынам і прывяло да падпісання Гітлерам дырэктывы № 34 ад 30 ліпеня 1941 г., у якой аддадзены загад самай моцнай групоўцы вермахта — групе армій "Цэнтр" — спыніць наступленне і перайсці да абароны[12]. На думку ж М.Мягкова, галоўнай прычынай прыняцця Гітлерам дырэктывы № 34 ад 30 ліпеня 1941 г. сталі баі за Смаленск. Аднак з нямецкіх дакументаў бачна, што гэта зусім не так. Менавіта гомельская групоўка часцей Чырвонай арміі адыграла вырашальную ролю ў прыняцці гэтай дырэктывы.

Таксама заўважым, што расійскі аўтар пры характарыстыцы асноўных падзей ліпеня 1941 г. толькі згадвае "акружаны Магілёў" (с. 108), не паказваючы яго сапраўднага значэння ў абароне дняпроўскага рубяжа. Насамрэч гэта была ўнікальная аперацыя, праведзеная ва ўмовах акружэння і без камандавання зверху, якую самі немцы называлі ў дакументах Магілёўскай бітвай[13].

Такім чынам, праводзячы аналіз баявых дзеянняў Заходняга фронту на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., расійскі даследчык прапаноўвае традыцыйныя для сучаснай расійскай ваеннай гістарыяграфіі навуковыя ацэнкі. Пры гэтым аўтар выкарыстаў даволі абмежаваную базу крыніц (выключна з фондаў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны РФ у Падольску) без звароту да дакументаў з Федэральнага ваеннага архіва Германіі ў Фрайбургу, найноўшых выданняў нямецкіх гісторыкаў, а таксама даследаванняў беларускіх навукоўцаў[14].

У **другой частцы** — **"Беларусь"** (с. 241—536) — беларускімі ваеннымі гісторыкамі прадстаўлены публікацыі: "Заходняя Асобая ваенная акруга і Беларусь напярэдадні вайны" (А.Літвін), "Бітва за Беларусь летам 1941 года" (А.Літвін, І.Варанкова), "Акупацыя і пачатак антыфашысцкага супраціўлення" (У.Кузьменка, І.Варанкова), "Вайна і беларускае грамадства" (У.Кузьменка, І.Варанкова), "1941 год у памяці пакаленняў" (А.Каваленя). Станоўча ацэньваючы спробу разгляду беларускімі гісторыкамі згада-

ных вышэй тэм, спынімся падрабязна толькі на адной з іх, датычнай баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Калі расійскія гісторыкі разглядаюць гэтыя падзеі ў якасці "катастрофы лета 1941 года", то беларускія — у якасці "бітвы за Беларусь летам 1941 года".

Аўтары імкнуліся ўсебакова, дэталёва і надзвычай скрупулёзна ахарактарызаваць важнейшыя баявыя дзеянні Чырвонай арміі. Узважана і даволі аб'ектыўна разгледжана дзейнасць кіраўніцтва Заходняй Асобай ваеннай акругі. Выказаныя меркаванні падмацаваныя дакументамі, апублікаванымі ў другой кнізе выдання (с. 311). Сярод выкарыстаных дакументальных і гістарыяграфічных крыніц — матэрыялы з беларускіх, нямецкіх і расійскіх архіваў, працы амерыканскіх, беларускіх, нямецкіх і расійскіх даследчыкаў.

А.Літвін і І.Варанкова на падставе шматлікіх фактаў раскрываюць трагічныя і гераічныя падзеі на беларускай зямлі летам 1941 г., асэнсоўваючы прычыны паражэння савецкіх войскаў і паказваючы ролю дзяржаўных і ваенных структур у арганізацыі адпору ворагу. Пачынаецца разгляд з колькасных даных (тэхнікі і асабовага складу) войскаў нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў. Тут прыведзены тыя ж лічбы, што і ў матэрыяле М.Мягкова (с. 78, 302). Аднак калі М.Мягкоў спаслаўся на расійскую ілюстраваную энцыклапедыю "Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гадоў", то беларускія гісторыкі звярнуліся да 10-томнай нямецкамоўнай працы "Германскі рэйх і Другая сусветная вайна". Вельмі важна, што ў матэрыяле пададзены звесткі аб колькасным складзе абодвух бакоў. Беларускія даследчыкі аспрэчваюць тэзіс аб тым, што прычынай няўдач Чырвонай арміі летам 1941 г. з'яўлялася вялікая колькасная перавага нямецкіх войскаў (с. 308-309). Яны прыходзяць да важнай навуковай высновы, што *"перавагу нямецкіх войскаў у пачатку вайны неабходна шукаць не сярод колькасных паказчыкаў, як гэта рабілася да гэтага часу, а сярод якасных у самым шырокім сэнсе слова"* (пры гэтым не раскрываючы сутнасць якаснага крытэрыя. — **С.Н.**) (с. 309).

Між тым звернем увагу на наступны сюжэт. Знаёмячы чытача з асноўнымі вайсковымі сіламі групы армій "Цэнтр", аўтары пішуць, што на правым нямецкім/левым савецкім фланзе ўдар забяспечвала 2-я танкавая група Г.Гудэрыяна ў складзе двух танкавых карпусоў — 24-га і 47-га (с. 305). Спасылка пры гэтым прыведзеная на ўспаміны камандуючага 2-й танкавай групай генерал-палкоўніка Г.Гудэрыяна. Паводле ж дакумента — дзённіка баявых дзеянняў 2-й танкавай групы, па стане на 21 чэрвеня 1941 г. у склад 2-й танкавай групы ўваходзілі 24-ы, 47-ы і <u>46-ы</u> танкавыя карпусы[15]. Гэта толькі адзін прыклад таго, што, абапіраючыся толькі на мемуарную літаратуру, немагчыма аднавіць рэальную карціну падзей.

З самага пачатку разгляду баявых дзеянняў Заходняга фронту аўтары аспрэчваюць віну камандуючага франтам Д.Паўлава і яго бліжэйшага акружэння за паражэнне Чырвонай арміі ў першыя дні вайны. Даследчыкі звяртаюцца да крыніц, сярод якіх — малавядомыя матэрыялы Судовага следства па абвінавачванні каманднага складу Заходняй Асобай ваеннай акругі — Д.Паўлава, В.Клімаўскіх, А.Грыгор'ева і А.Карабкова, пратаколы закрытага пасяджэння па іх справе, а таксама іншыя дакументы[16]. Паводле іх, за пару дзён да вайны Д.Паўлаў звярнуўся да вышэйшага ваеннага камандавання па дазвол на заняцце палявых умацаванняў уздоўж граніцы. Аднак наркам абароны С.Цімашэнка *"не дазволіў заняць палявых умацаванняў, паколькі гэта можа выклікаць правакацыю сярод немцаў"*[17]. І нават нягледзячы на неграматнае ўмяшанне зверху, аб'ектыўную адарванасць ад войскаў, камандаванне Заходняга фронту прыкладала ўсе намаганні, каб наладзіць кіраванне войскамі і збіць тэмпы наступлення праціўніка.

Комплексны падыход да вывучэння баявых дзеянняў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. патрабаваў ад аўтараў прыцягнення не толькі значнай колькасці новых фактычных даных, але і вынікаў аналізу малавядомых аспектаў баёў у беларускай гістарыяграфіі. Аднак часам аўтары выкарыстоўваюць звесткі, якія не вытрымліваюць навуковай крытыкі. Разгледзім гэта на шэрагу прыкладаў.

Так, са спасылкай на навукова-папулярную працу У.Бяшанава аўтары пішуць, што ў выніку раптоўнага артылерыйскага абстрэлу пяць батальёнаў 6-й і два батальёны 42-й стралковых дывізій, якія абаранялі Брэсцкую крэпасць, страцілі да 50% асабовага складу (с. 312). У той жа час на наступнай старонцы яны сцвярджаюць, што а 9-й гадзіне раніцы 22 чэрвеня 1941 г. нямецкія войскі акружылі крэпасць шчыльным кальцом, у выніку чаго ад 7 тыс. да 8 тыс. чалавек апынуліся ў аблозе (с. 313). Узнікаюць пытанні, колькі ж абаронцаў вяло бой з крэпасці і ад якой агульнай колькасці салдатаў і афіцэраў трэба весці іх адлік.

Патрабуюць удакладненняў і іншыя аспекты гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці. Так, аўтары сцвярджаюць, што ў ходзе абароны крэпасці *"даўжэй за ўсіх трымалася цытадэль"* (Цытадэль. — **С.Н.**) (с. 314). Што ў гэтым выпадку маецца на ўвазе? Асабліва калі зыходзіць з агульнавядомых фактаў, што немцы яшчэ ў першы дзень абароны прарваліся ўнутр крэпасці. Больш за тое, нямецкія крыніцы падаюць звесткі, што апошнім найбольш трывалым ачагом абароны амаль да канца месяца заставаўся Усходні форт, дзе ўпартую абарону арганізаваў камандзір 44-га стралковага палка маёр П.Гаўрылаў. Не зусім зразумелым з'яўляецца і сцвярджэнне, што легендарны абаронца быў узяты ў нямецкі палон 27 ліпеня 1941 г. (с. 314). Сам П.Гаўрылаў ва ўспамінах, апублікаваных у сярэдзіне 1970-х гг., пісаў пра 32-дзённае змаганне на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання[18], г. зн. да 23 ліпеня.

Звернем увагу на сцвярджэнне, прыведзенае са спасылкай на публікацыю 1980 г.: аб тым, што пасля стварэння адзінага штаба абароны 24 чэрвеня 1941 г.

было прынята рашэнне прарывацца з акружэння (с. 314). Насамрэч стварэнне штаба абароны Брэсцкай крэпасці неабходна разглядаць як сведчанне таго, што нават у крайне цяжкіх умовах абаронцы імкнуліся арганізавацца і працягваць барацьбу. Лепш за ўсё гэтую думку пацвярджае наступная фраза з загада № 1 ад 24 чэрвеня 1941 г.: *"Узнікшая абстаноўка ў крэпасці патрабуе стварэння адзінага кіраўніцтва і арганізаванага баявога дзеяння для далейшай барацьбы з праціўнікам"*[19].

Таксама аўтары пішуць, што Усходні форт, які з першых гадзін вайны стаў ачагом жорсткага супраціўлення, 30 чэрвеня быў захоплены штурмам пасля мінамётнага і артылерыйскага абстрэлаў (с. 314). Аднак, паводле данясення камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска, інтэнсіўны артабстрэл форта быў безвыніковы. І толькі пасля скідвання 500-кг, а потым 1800-кг авіябомбаў форт быў цалкам захоплены[20], аднак ніякага штурму насамрэч не было.

Далей аўтары аналізуюць ход прыгранічных баёў на Берасцейшчыне і звяртаюць увагу на рашэнне, якое спачатку прыняў камандуючы 4-й арміяй А.Карабкоў. Яго сутнасць заключалася ў тым, каб у надзвычай складаных умовах арганізаваць абарону на бліжэйшым зручным тактычным рубяжы на паўночны ўсход ад Брэста. Былі намечаныя некалькі абарончых пазіцый — у раёне Жабінкі, Кобрына і Пружан і па лініі р. Мухавец. Аднак камандаванне фронту думала не пра абарону, а разлічвала на наступленне. 23 чэрвеня яно аддало загад перавесці армію на штат ваеннага часу, разграміць праціўніка ў раёне Брэста і выйсці да граніцы (с. 316). Гэты контрудар скончыўся правалам.

Падсумоўваючы разгляд баявых падзей у паласе абароны 4-й арміі, аўтары канстатуюць, што да 25 чэрвеня прыгранічныя абарончыя баі Заходняга фронту на гэтым рубяжы былі цалкам прайграныя. Нямецкаму камандаванню ўдалося поўнасцю ажыццявіць тут свае планы (с. 320).

Другім важным рубяжом абароны Заходняга фронту, які разглядаюць аўтары, з'яўляўся так званы Беластоцкі выступ, дзе знаходзілася 10-я армія на чале з К.Голубевым — адна з самых моцных у акрузе. Разам з 3-й арміяй пад камандаваннем генерал-лейтэнанта В.Кузняцова (якая вяла абарончыя баі ў раёне Гродна, Ліды і Навагрудка) яны складалі цэнтральную групоўку Заходняга фронту. На вялікі жаль, савецкае ваеннае камандаванне, якое не валодала рэальнай аператыўнай інфармацыяй аб сітуацыі на месцах і знаходзілася ў палоне даваенных уяўленняў аб наступальнай вайне, замест арганізацыі аператыўнага адыходу войскаў з Беластоцкага выступу дало загады на правядзенне контрудараў. Адзін з іх павінны былі правесці два механізаваныя карпусы. Мэтай з'яўлялася нанясенне ўдару ў фланг і тыл Сувалкаўскай групоўкі праціўніка, каб да вечара 24 чэрвеня акружыць яе і разграміць. Аднак у ходзе баёў у раёне Гродна савецкія войскі былі практычна разгромленыя (с. 322).

Важна адзначыць, што, разглядаючы маштабы страт, панесеных войскамі Заходняга фронту ў прыгранічных баях, аўтары прыводзяць шмат лічбаў, якія тычацца пераважна стратаў у тэхніцы. Між тым адкрытым пакінута пытанне аб людскіх стратах, якія з савецкай гістарыяграфіі вядомы як "беззваротныя страты". Аўтары тлумачаць, што "беззваротныя страты" ўключалі тых, хто быў забіты ці памёр ад ранення, а таксама тых, хто трапіў у палон (с. 398). Аднак далей яны не ідуць, прыводзяць толькі голыя лічбы "беззваротных страт" (341 012 чалавек), панесеных часцямі Чырвонай арміі ў прыгранічных баях на тэрыторыі Беларусі.

Між тым, даследуючы прыгранічныя баі на Берасцейшчыне і Гродзеншчыне ў пачатку вайны, важна памятаць, што большасць чырвонаармейцаў не загінулі, а трапілі ў нямецкі палон. Так, у загадзе камандуючага групай армій "Цэнтр" ад 7 ліпеня 1941 г. паведамлялася, што паспяхова завершаныя бітвы вермахта ў раёне Беластока і Мінска, у палон узята 287 704 чырвонаармейцы[21].

Далей аўтары падрабязна асвятляюць абарончыя баі, якія Чырвоная армія вяла ў ходзе абароны Мінска. У матэрыялах адзначана, што Мінскі ўмацаваны раён (УР), на будаўніцтва якога ў свой час былі выдаткаваны значныя сродкі, не выканаў свае функцыі. У многіх дотах узбраенне было дэманціравана, і толькі асобныя з іх адыгралі пэўную ролю ў затрыманні германскіх войскаў. Абарона сталіцы фарміравалася асобнымі вузламі супраціўлення, якія ствараліся на найбольш верагодных і танканебяспечных напрамках наступлення праціўніка. Так, на аснове нямецкага дакумента аўтары падрабязна распавядаюць пра баі, якія мелі месца ў раёне Астрашыцкага Гарадка (с. 360). У працы даецца даволі падрабязнае апісанне горада Мінска і падзей у ім пасля захопу ў другой палове дня 28 чэрвеня 1941 г. Са спасылкай на нямецкага гісторыка К.Герлаха практычна ўпершыню гаворыцца аб значных людскіх стратах падчас бамбардзіровак. Важна, што пры гэтым аўтары аспрэчваюць традыцыйную лічбу, якая фігуравала ў матэрыялах Мінскай абласной камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нагадаем, што гаворка ішла пра 186 чалавек, якія загінулі ў горадзе да моманту яго захопу. Аўтары ж гавораць пра прыкладна тысячу чалавек (с. 363).

Наступным рубяжом абароны стала рака Бярэзіна. Планавалася, што наступленне вермахта магчыма будзе затрымаць да таго моманту, пакуль не адбудзецца канцэнтрацыя савецкіх войскаў у раёне Оршы, Магілёва, Жлобіна, Рагачова. Такую задачу ставіла перад Заходнім фронтам Стаўка Галоўнага камандавання, зыходзячы з таго, што наяўныя сілы фронту ні ў якім разе не дапусцяць прарыву часцей праціўніка ў раёне Бабруйска і раёне Барысава (с. 366). Падрабязна разглядаючы баявыя дзеянні, якія разгарнуліся на розных участках абароны ў раёне Барысава, аўтары прыходзяць да важнай высновы аб тым, што тактыка контратак і абароны, якую ўдала прымяняў у баях з 18-й нямецкай танкавай дывізіяй каман-

дзір 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі, перакінутай пад Барысаў, з'яўлялася ўзорнай. Менавіта яе трэба было выкарыстоўваць для вядзення актыўнай абароны на ўсіх абарончых рубяжах Заходняга фронту (с. 370).

Далей разглядаюцца контрудары, праведзеныя савецкімі войскамі на Віцебшчыне і Гомельшчыне ў пачатку — сярэдзіне ліпеня 1941 г. Першы з іх наносілі 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы ў фланг і тыл полацкай групоўкі праціўніка з мэтай яе разгрому і авалодання раёнамі каля м. Камень, Лепель, Іконкі (с. 375). Рэканструкцыю тых падзей аўтары праводзяць галоўным чынам на падставе ўспамінаў начальніка штаба 13-й арміі генерала С.Іванова. Паводле іх, ударную моц двух карпусоў складалі каля 1400 баяздольных машын, тады як іх агульная колькасць была 1639 танкаў (на ўліку 5-га мехкорпуса — 924 танкі, а 7-га — 715 танкаў) (с. 376). Аднак, паводле архіўных дакументаў, уведзеных у апошні час расійскім гісторыкам А.Ісаевым, колькасць танкавага парка 7-га мехкорпуса па стане на 6 ліпеня 1941 г. складала толькі 507 баявых адзінак, тады як 5-га — 838 танкаў[22].

Заўважым, што падзеі паказаныя выключна праз разгляд баявых сілаў савецкага боку. З матэрыялу атрымліваецца, што супраць двух паўнавартасных мехкарпусоў вялі бой дзве нямецкія танкавыя дывізіі — 7-я і 17-я. Аднак насамрэч у баях пад Сянно ўдзельнічалі 7-я дывізія, толькі адна баявая група (80 танкаў) 17-й нямецкай танкавай дывізіі, а таксама іншыя нямецкія танкавыя падраздзяленні[23].

Як паказваюць аўтары, асабліва жорсткія баі вяліся Заходнім фронтам на дняпроўскім рубяжы ў раёне Оршы, Шклова, Магілёва, Жлобіна і Рагачова. Асаблівае месца ў матэрыяле займае абарона Магілёва (с. 387), якая пачалася 3 ліпеня і доўжылася да 26 ліпеня 1941 г. Утрымліваючы горад да апошняй магчымасці, часці генерала Раманава здолелі скаваць буйную групоўку праціўніка і нанесці ёй адчувальныя страты (с. 388). Адразу ж адзначым, што ўвядзенне ў дачыненні да гісторыі абароны Магілёва дэфініцыі "бітва" вельмі важна для беларускай ваеннай гістарыяграфіі. Самі немцы выкарыстоўвалі ў дакументах азначэнні "Крэпасць Магілёў", "Бастыён на Дняпры", "Магілёўская бітва". Між тым наколькі адпавядае гістарычнай рэчаіснасці такое сцвярджэнне — *"спробы нямецкіх войскаў зламаць абарону працягваліся і ў наступныя дні, а адна з самых сур'ёзных была зроблена імі 11 ліпеня"* (с. 386), калі асабліва цяжкай склалася абстаноўка ў раёне сёл Буйнічы і Цішоўка, дзе трымаў абарону 388-ы стралковы полк і народнае апалчэнне (с. 387). Аднак гэтую дату не пацвярджаюць ні аператыўныя зводкі штаба 172-й сталковай дывізіі[24], ні нямецкае данясенне аб баях на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г.[25]. Не зусім дакладным з'яўляецца і сцвярджэнне аб тым, што пасля спробы прарыву *"Раманаў арганізаваў на тэрыторыі вобласці партызанскі атрад, але быў выданы здраднікам і публічна пакараны"* (с. 388). Насамрэч дакументальна зафіксавана, што з восені 1941 г. генерал М.Раманаў спачатку апынуўся ў лагеры Лупалава, а потым знаходзіўся сярод вязняў аднаго са спецыяльных лагераў "Афлаг XIII С" побач з баварскім горадам Хамельбург. 3 снежня 1941 г. ён памёр ад наступстваў ранення, атрыманага ў час выхаду з акружэння пад Магілёвам[26].

Паказваючы баявыя дзеянні пад Рагачовам і Жлобінам, аўтары падрабязна знаёмяць чытача з контрударам 21-й арміі, перад якой ставілася задача адцягнуць на сябе сілы праціўніка. 13 ліпеня злучэннямі 63-га стралковага корпуса генерал-маёра Л.Пятроўскага яна пачала паспяховае наступленне ў напрамку названых гарадоў. Аўтары прыходзяць да высновы, што гэта быў бясспрэчны поспех — магчыма, першы поспех за ўвесь пачатковы перыяд вайны. Пастаўленая задача была не толькі выканана, а нават перавыканана (с. 393). 24 ліпеня для аператыўнасці кіравання войскамі ў раёне Гомеля Стаўка стварыла новы фронт — Цэнтральны, назва якога ў пэўнай меры сведчыць аб яго значэнні ў планах прыкрыцця маскоўскага напрамку наступлення вермахта. Аб аператыўным значэнні контрудару корпуса сведчыць таксама дырэктыва А.Гітлера № 33, на якую спасылаюцца аўтары матэрыялу (с. 393). У ёй гаворыцца аб тэрміновай неабходнасці ліквідаваць сілы праціўніка, якія скавалі буйныя сілы нямецкай пяхоты. Між тым, на наш погляд, баявыя дзеянні Заходняга і Цэнтральнага франтоў на тэрыторыі Гомельшчыны былі не столькі аператыўнага, колькі стратэгічнага значэння. Чарговая дырэктыва за нумарам 34 ад 30 ліпеня 1941 г. прынцыпова мяняла стратэгічнае становішча для ўсёй групы армій "Цэнтр". Апошняя спыняла наступленне на Маскву і пераходзіла да абароны. З гэтага вынікае канчатковае значэнне барацьбы Чырвонай арміі за Беларусь летам 1941 г.

У падсумаванні аўтары прыходзяць да высновы, што ў 1941 г. на тэрыторыі Беларусі Чырвоная армія *"пацярпела адно з самых трагічных і самых жахлівых паражэнняў, якія вядомыя ў сусветнай гісторыі"* (с. 397). У якасці пацвярджэння прыведзены лічбы агульных страт Заходняга фронту ў жывой сіле. Са спасылкай на дакументальнае выданне "Гриф секретности снят" аўтары паказваюць, што толькі за 18 першых дзён вайны (да 9 ліпеня), у ходзе якіх мела месца так званая Беларуская стратэгічная абарончая аперацыя, з 625 000 чалавек было страчана 417 729, з якіх 341 012 з'яўляліся безвозвратнымі стратамі (с. 398). У гэтай сувязі ўзнікае пытанне, якія ж лічбы трагедыі датычна ўсёй Беларусі, бітва за якую цягнулася фактычна да канца жніўня, а не завяршылася 9 ліпеня разам з канцом абарончых баёў. Паводле дакументаў вермахта, у якіх вёўся ўлік савецкіх ваеннапалонных, групай армій "Цэнтр" да канца жніўня 1941 г. былі ўзятыя ў палон 784 тыс. чырвонаармейцаў, з якіх на тэрыторыі Беларусі ў палон трапілі 436 тыс., або 2/3 ад баявога складу і колькасці войскаў фронту на момант пачатку баявых дзеянняў у Беларусі летам 1941 г.[27].

На заканчэнне нарыса аўтары звяртаюцца да асноўных прычын, якія прывялі да паражэння савецкіх войскаў у пачатку вайны. У гэтай сувязі нам падаецца важнай наступная думка: *"Тое, што палітычнае і ваеннае кіраўніцтва СССР не здолелі прыняць адэкватныя рэальнай сітуацыі рашэнні, з'яўляецца вялікай палітычнай і стратэгічнай памылкай, якая мяжуе са злачынствам перад уласным* (савецкім. — **С.Н.**) *народам"* (с. 398).

**Трэцяя частка** — **"Украіна"** (с. 537—713) — уключае 11 раздзелаў, кожны з якіх дазваляе ўбачыць гістарычныя падзеі ў прамежку часу ад перадваеннага перыяду да ўсталявання германскага акупацыйнага рэжыму: 1) пачатак Другой сусветнай вайны і "ўкраінскае пытанне"; 2) ваенныя дзеянні на тэрыторыі Украіны ў 1941 г.; 3) пачатак вайны: улада і грамадства; 4) мабілізацыя ў дзеючую армію; 5) абаронцы ўкраінскай зямлі: народнае апалчэнне і знішчальныя батальёны; 6) эвакуацыя на Усход; 7) Феміда ваеннага часу; 8) усталяванне акупацыйнага рэжыму ва Украіне; 9) лёс савецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі Украіны; 10) рух супраціву на пачатковым этапе вайны; 11) палітыка акупантаў у эканамічнай і сацыягуманітарнай сферах. Аўтарамі падрыхтаваных гістарычных нарысаў з'яўляюцца прафесійныя ваенныя гісторыкі Украіны — Т.Вронская, У.Грыцюк, С.Кокін, А.Лысенка, Т.Пастушэнка. Персанальнае аўтарства па раздзелах не пазначана.

Спынімся на матэрыяле **"Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Украіны летам 1941 г."** (с. 552—585), аўтарам якога, на наш погляд, з'яўляецца вядучы ваенны гісторык У.Грыцюк. Украінскі аўтар прапанаваў скарочаны варыянт публікацыі, якая годам раней была змешчана ў акадэмічным выданні[28]. У ёй раскрыты прыгранічныя баі (22 чэрвеня — 10 ліпеня 1941 г.) (с. 561—565), абарончыя аперацыі (баявыя дзеянні) войскаў Паўднёва-Заходняга фронту на Правабярэжнай Украіне (10 ліпеня — канец жніўня 1941 г.) (с. 565—569), абарона Кіева, катастрофа Паўднёва-Заходняга фронту і яе наступствы (с. 569—578), абарона Адэсы (5 жніўня — 16 кастрычніка 1941 г.) (с. 578—580).

Пачынаючы разгляд ваенных падзей на тэрыторыі Украіны, аўтар канстатуе, што гітлераўскае камандаванне не расцэньвала паўднёвы напрамак як галоўны (с. 554). Важна, што пры гэтым прыведзены дакладныя колькасныя звесткі пра групу армій "Поўдзень", у якой на момант пачатку вайны ў баявых часцях на ўліку знаходзілася 992 тыс. чалавек, 15 940 гармат і 725 танкаў.

Важнай адметнасцю матэрыялу з'яўляецца параўнанне баявых падзей ва Украіне і Беларусі. Украінскі гісторык пастаянна звяртаецца да гэтага прыёму, дэманструючы ўзровень падрыхтаванасці войскаў Паўднёва-Заходняга і Паўднёвага франтоў да выканання пастаўленых баявых задач. Хоць у выніку аўтар і прыходзіць да абагульняючай высновы, што савецкія войскі апынуліся фактычна не падрыхтаванымі да абароны, і сустрэчныя бітвы ў прыгранічных раёнах былі цалкам прайграны, аднак ён канстатуе, што войскі Паўднёва-Заходняга фронту аказалі найбольшы супраціў у параўнанні з іншымі ўчасткамі савецка-германскага фронту. На тэрыторыі Украіны не было дапушчана акружэнне савецкіх войскаў і не адбылося поўнага разгрому асноўных сілаў, як гэта здарылася з Заходнім фронтам у Беларусі (с. 562). Аўтар сцвярджае, што на паўднёва-заходнім напрамку, у адрозненне ад заходняга, да 10 ліпеня гітлераўскаму камандаванню разграміць асноўныя сілы Чырвонай арміі не ўдалося (с. 565). Больш за тое, контрудары дасягалі сваіх мэтаў — спынялі праціўніка ці затрымлівалі яго на пэўны час. Так, напрыклад, у раёне Роўна 25 чэрвеня два корпусы Чырвонай арміі нанеслі ўдары па праціўніку і здолелі затрымаць яго да 7 ліпеня. Між тым аўтар адзначае, што наспех падрыхтаваныя і недастаткова арганізаваныя контрудары мелі нізкую эфектыўнасць (с. 362). Ён выводзіць, што ў ходзе прыгранічных баёў Чырвоная армія змагалася ва ўмовах, калі гітлераўцы захапілі стратэгічную ініцыятыву, а авіяцыя праціўніка панавала ў паветры. Гэта стала прычынай выключнай складанасці кіравання войскамі. Як вынік, савецкія войскі адышлі ўглыб да 250—300 км. У ходзе прыгранічных баёў ва Украіне беззваротныя страты склалі больш за 172 тыс. чалавек, санітарныя — каля 70 тыс. З тэхнікі былі страчаны 4381 танк, 5806 гармат і мінамётаў і 1218 самалётаў (с. 564). Як бачым, украінскі гісторык пакуль карыстаецца агульнапрынятымі падыходамі ў дачыненні да паказу страт асабовага складу і не ўздымае пытанне аб колькасці савецкіх ваеннапалонных.

Між тым У.Грыцюк пайшоў значна далей у навуковай ацэнцы прыгранічных абарончых баёў ва Украіне, якія ў айчыннай літаратуры традыцыйна разглядаюцца з 22 чэрвеня па 9 ліпеня 1941 г. Гэты перыяд іх вядзення ён падзяляе на два асноўныя этапы: 1) з 22 па 30 чэрвеня, калі перад савецкімі войскамі ставіліся задачы па разгроме груповак праціўніка і пераходзе да наступлення; 2) з 30 чэрвеня па 9 ліпеня, калі планавалася абарончая аперацыя і арганізоўваўся адыход войскаў Паўднёва-Заходняга і Паўднёвага франтоў на лінію ўмацаваных раёнаў старой граніцы (с. 565).

Апісваючы прыгранічныя баі, даследчык чамусьці не паказвае адзін з самых важных эпізодаў абарончай бітвы на Украіне — контрудар некалькіх механізаваных карпусоў (8-га, 9-га, 15-га і 19-га) у раёне Луцк — Брады — Дубна, дзе з 26 па 30 чэрвеня 1941 г. адбылася самая вялікая сустрэчная танкавая бітва, калі на ўчастку працягласцю 70 км з двух бакоў сутыкнуліся амаль 2 тыс. танкаў. Хоць савецкія войскі пацярпелі паражэнне, аднак упартыя баі на пэўны час спынілі вермахт, забяспечылі адыход іншых часцей і сталі першымі крокамі на шляху да крушэння германскага бліцкрыгу[29].

Звернем увагу на тое, што ўкраінскі аўтар аспрэчвае назву, уведзеную ў пасляваенны час у дачыненні да прыгранічных абарончых баёў — стратэгічная абарончая аперацыя ў Заходняй Украіне і Бе-

сарабії. На яго думку, з пункта гледжання ваеннага мастацтва казаць пра абарончую аперацыю не карэктна. Больш дакладным будзе з'яўляцца тэрмін "бітва" (сражение) (с. 565).

Паказваючы баявыя дзеянні войскаў Паўднёва-Заходняга фронту на Правабярэжнай Украіне з 10 ліпеня да канца жніўня 1941 г., аўтар прыходзіць да наступнай высновы: у канцы жніўня пасля адыходу войскаў за Днепр абарончая аперацыя на Правабярэжнай Украіне скончылася. Чырвоная армія вымушана была пакінуць гэтую тэрыторыю, панесла вялікія страты ў людзях і тэхніцы. Даследчык звяртае ўвагу на тое, што да пачатку верасня на стыку двух стратэгічных напрамкаў — заходняга і паўднёва-заходняга — адбылося зняшчэнне значнай часткі сіл групы армій "Цэнтр" на поўдзень (с. 568).

Асобную старонку ў летапісе ваенных падзей на тэрыторыі Украіны займае абарона Кіева. Даследчык разглядае арганізацыю абароны, ход баёў, паказвае мужнасць абаронцаў горада. На заканчэнне ён канстатуе, што абарона сталіцы Украіны ў 1941 г. стала адной з найбольш трагічных і гераічных старонак вайны. У стратэгічным плане абарончыя баі за Кіеў у канцы лета — пачатку восені 1941 г. адцягнулі значныя сілы вермахта з маскоўскага напрамку. Пры гэтым, аднак, катастрофа Паўднёва-Заходняга фронту пад Кіевам прывяла да таго, што войскі Чырвонай арміі былі вымушаныя адмовіцца ад працягу актыўных баявых дзеянняў на тэрыторыі Правабярэжнай Украіны (с. 578).

Такім чынам, аналіз трох матэрыялаў паказвае, што расійскія, беларускія і ўкраінскія аўтары выкарысталі розныя падыходы ў падачы матэрыялу — ад адлюстравання асобных фрагментаў да стварэння абагульненай карціны баявых дзеянняў Чырвонай арміі летам 1941 г. Асноўная ўвага аўтараў была сканцэнтраваная на ходзе і выніках прыгранічных баёў, а таксама супрацьстаянні праціўніку на іншых рубяжах абароны. Пры гэтым агульнай карціны баёў на ўсім савецка-германскім фронце стварыць так і не ўдалося.

У якасці **метадалагічных назіранняў** адзначым наступныя моманты.

Аналіз новай працы паказвае, што гісторыкамі ўжо пераадольваецца адна з вузлавых праблем у даследаванні пачатковага перыяду вайны — вузкасць крыніцазнаўчай базы. Аднак увядзенне новых дакументальных крыніц (пераважна савецкага паходжання) выклікае неабходнасць іх навуковай верыфікацыі, а таксама ставіць на парадак дня цэлы шэраг іншых крыніцазнаўчых праблем, у тым ліку тэорыі і метадалогіі. Як бачна з трох нарысаў, гісторыкі выкарыстоўваюць розныя дэфініцыі, звяртаючыся як да традыцыйных, так і да новых тэрмінаў. Прычым тычыцца гэта нават назвы самой вайны. Калі ў беларускім і расійскім тэкстах гэта "Вялікая Айчынная вайна", то ва ўкраінскім навуковым дыскурсе больш важкае месца набывае назва "Другая сусветная вайна"[30]. У якасці прыкладу варта прывесці двухтомнае акадэмічнае выданне "Україна ў Другій світовій війні: погляд з XXI ст." (2011)[31]. Там выкарыстана толькі азначэнне "Другая сусветная вайна" (за выключэннем матэрыялу У.Грыцюка "Стратэгічныя і франтавыя аперацыі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Украіны"[32]). Відавочна, што ў грамадскім дыскурсе Украіны фактычна адбываецца "вайна дэфініцый"[33].

Ёсць у кнізе разыходжанні і адносна наступных азначэнняў: "фашысцкая Германія" (расійскія даследчыкі), "нацысцкая Германія" (беларускія, расійскія і ўкраінскія), "нямецка-фашысцкія войскі" (расійскія), "гітлераўцы" (беларускія), "нацысцкія акупанты" (украінскія) і інш. Так, безумоўна неабходна карэктаваць устойлівае азначэнне "нямецка-фашысцкія войскі". Як вядома, вермахт з'яўляўся адным са структурных элементаў нацысцкай Германіі, гэта значыць войскі былі выключна германскімі ("германская армія", "германскія войскі", "германскае камандаванне")[34], а не нямецкімі. На жаль, у кнізе няма тлумачэння адносна ўжывання розных дэфініцый і аўтарскіх прапаноў па далейшым выкарыстанні адпаведнай тэрміналогіі ў навуковай літаратуры і грамадскім дыскурсе.

Выкананы сумесны праект сведчыць таксама пра тое, што на постсавецкай прасторы праходзяць працэсы не толькі складвання нацыянальных школ, але і змянення навукова-пазнавальных крытэрыяў ацэнкі ў дачыненні да канкрэтных гістарычных падзей. Між тым, як адзначаецца ў выданні, разнастайнасць падыходаў пры вывучэнні праблем і выкладанні сваіх поглядаў, асваенне новых дакументальных крыніц (у тым ліку замежнага паходжання) станоўча ўплываюць на аб'ектыўнае асвятленне малавывучаных старонак вайны (с. 239). Аднак вынік сумеснай працы паказвае, што гісторыкам трох усходнеславянскіх краін пакуль не ўдалося прадставіць блізкае разуменне агульных падзей. Асноўныя намаганні былі сканцэнтраваныя на рэгіянальным адлюстраванні падзей (за выключэннем расійскіх гісторыкаў, якія імкнуліся паказаць агульную панараму падзей). Праца ідзе на аснове толькі айчынных гістарыяграфічных фактаў і навуковай літаратуры[35], без увагі застаюцца важныя замежныя даследаванні[36]. Сёння ж на парадак дня выносяцца пытанні аб неабходнасці ўключэння нацыянальных гістарыяграфій у сусветны гістарыяграфічны працэс[37].

## II. Баявыя дзеянні Чырвонай арміі і германскага вермахта летам 1941 г. у святле новых дакументаў і матэрыялаў

У другую кнігу выдання "1941 год. Страна в огне" пад назвай **"Документы и материалы"** уключаны 383 дакументальныя крыніцы, якія пераважна адлюстроўваюць дзейнасць савецкага дзяржаўнага і ваеннага кіраўніцтва па арганізацыі адпору захопнікам. Таксама прыведзены дакументы, якія дазваляюць атрымаць уяўленне аб міжнародным становішчы СССР і дыпламатычных намаганнях па ўсталяванні сувязяў з патэнцыяльнымі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі. Большасць дакументаў і




матэрыялаў уводзіцца ў навуковы зварот упершыню. Са свайго боку звернем увагу на тыя крыніцы, што тычацца ходу баявых дзеянняў на Заходнім і Паўднёва-Заходнім франтах.

Галоўным чынам гэта дакументы савецкага паходжання. З агульнай колькасці крыніц нямецкія складаюць толькі 14%, прычым калі ў беларускіх і ўкраінскіх гісторыкаў гэта кожны 5-ты дакумент (20%), то ў расійскіх — толькі кожны 16-ты (6%).

Дакументальны блок расійскіх гісторыкаў складаецца са 134 дакументаў, з іх у асобны раздзел "Война" вылучаны 93 дакументы і матэрыялы. Першы раздзел утрымлівае 41 дакумент па перадваенным перыядзе гісторыі СССР. З другога раздзела 12 дакументаў даюць магчымасць для разгляду баявых дзеянняў Чырвонай арміі. Асаблівую цікавасць выклікаюць тры з іх: данясенне камандзіра 11-га механізаванага корпуса Чырвонай арміі генерал-лейтэнанта К.Маставенкі аб баявых дзеяннях корпуса за перыяд з 22 чэрвеня да 1 ліпеня 1941 г. (дак. 58), тлумачэнне генерал-маёра Б.Фаміна намесніку начальніка генеральнага штаба Савецкай арміі па ваенна-навуковай рабоце генералу арміі В.Курасаву аб дзейнасці генерала Д.Паўлава (1956 г.) (дак. 78); данясенне былога начальніка аператыўнага штаба 10-й арміі падпалкоўніка С.Маркушэвіча намесніку начальніка штаба Заходняга фронту генералу Г.Маландзіну аб дзеяннях савецкіх войскаў у першыя дні вайны (дак. 92).

Дакументы беларускіх гісторыкаў таксама тэматычна згрупаваныя па двух раздзелах: Заходняя Асобая ваенная акруга напярэдадні вайны (студзень — 21 чэрвеня 1941 г.) (дак. 1—20); трагедыя і подзвіг народа на беларускай зямлі (22 чэрвеня — снежань 1941 г.) (дак. 21—127). У другім раздзеле прадстаўленыя дакументы савецкага боку: журналы баявых дзеянняў (дак. 21), баявыя загады (дак. 26, 90), баявыя данясенні (дак. 24, 25, 31, 37, 55, 62), баявыя распараджэнні (дак. 22, 28, 32, 43), разведвальныя зводкі (дак. 30, 41, 47, 58, 67), аператыўныя зводкі (дак. 33, 38, 42, 46, 54, 70, 91), даклады (дак. 65, 68, 71, 75, 84, 89, 92), справаздачы (дак. 104, 126). Баявым дзеянням прысвечаныя 34 дакументы, выяўленыя ў айчынных архівах. Таксама ў раздзеле прадстаўленыя 27 нямецкіх дакументаў: радыёзводкі (дак. 23, 29), аператыўныя загады (дак. 35, 49, 56, 60, 76, 78, 79, 80, 101, 111), штодзённыя зводкі (дак. 36, 39, 40, 69, 122, 124), данясенні (дак. 44, 57, 63, 66, ), рапарты (дак. 45), спіс расстраляных партызан (дак. 112).

Найбольш шматаспектна прадстаўленыя дакументы ва ўкраінскіх гісторыкаў. Як вынік, са 122 дакументальных крыніц баявыя дзеянні адлюстраваныя толькі ў дзясятку матэрыялаў, выяўленых у айчынных архівах. Гэта савецкія дырэктывы (дак. 17, 42, 54), аператыўныя зводкі (дак. 18), план абароны Кіева (дак. 19), аператыўная дырэктыва (дак. 20), баявое данясенне (дак. 22), загад (дак. 29), тэлеграмы (дак. 30, 63). З прыведзеных нямецкіх дакументаў баявым дзеянням прысвечаны толькі адзін — вытрымкі з ваеннага дзённіка начальніка генеральнага штаба сухапутных войскаў Ф.Гальдэра аб ходзе аперацыі па знішчэнні Кіеўскай групоўкі савецкіх войскаў (дак. 61).

Аналізуючы толькі тэматычна абмежаваныя дакументы, а таксама ўлічваючы агульны падыход пры падачы каля 400 дакументаў і матэрыялаў кнігі, неабходна заўважыць, што акадэмічныя гісторыкі фактычна пакідаюць чытача без дакладных навуковых каментараў. Намі не выяўлена ніводнага навуковага каментара да ўнікальных дакументаў, якія выклікаюць шмат пытанняў. Можна заключыць, што абсалютная большасць уведзеных дакументаў і матэрыялаў будзе незразумелай для чытачоў.

Выхад дзвюх кніг выдання "1941 год. Страна в огне", падрыхтаваных дзякуючы шматгадоваму беларуска-расійска-ўкраінскаму супрацоўніцтву, можна расцэньваць як знакавую падзею для сучаснай гістарыяграфіі. Выяўлены і сістэматызаваны ўнікальны гістарычны матэрыял не толькі дазваляе адкрыць новыя старонкі падзей 1941 г., але і ў вялікай ступені садзейнічае далейшаму развіццю ваенна-гістарычных даследаванняў.

Між тым дэталёвае знаёмства са зместам новага выдання падмацоўвае выснову, што за апошні час у Беларусі, Расіі і Украіне сфарміраваліся нацыянальныя школы ваенных гісторыкаў. З'яўляюцца новыя падыходы, погляды і ацэнкі падзей, дзякуючы якім стала магчымым больш разнабаковае асвятленне ваеннай гісторыі. Немалаважную ролю пачалі адыгрываць веды, атрыманыя ў выніку звароту да нямецкіх дакументаў і матэрыялаў. Відавочна, што без погляду на гістарычныя падзеі з розных пазіцый немагчыма стварыць аб'ектыўную карціну падзей.

[1] 1941 год. Страна в огне: В 2 кн. Кн. 1. Очерки. М.: ОЛМА Медиа Групп, 2011. — 720 с.; 1941 год: Страна в огне: В 2 кн. Кн. 2. Документы и материалы. М.: ОЛМА Медиа Групп, 2011. — 720 с.

[2] 1941 год. Страна в огне: В 2 кн. Кн. 1. Очерки. С. 5.

[3] Великая Отечественная без грифа секретности. Книга потерь. Новейшее справочное издание / Г.Ф.Кривошеев, В.М.Андроников, П.Д.Буриков, В.В.Гуркин. М., 2010. С. 25-26.

[4] Кульков Е., Мягков М., Ржешевский О. Война 1941—1945. Факты и документы. М., 2005. С. 53.

[5] Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. In 10 Bände. Bd. 4: Der Angriff auf die Sowjetunion. Stuttgard, 1983.

[6] Федэральны ваенны архіў Германии (далей — BA-MA). RH 27-3/29: Panzer-Regiment 6. Erfahrungsbericht: Kampf der II./Pz. Rg. 6 bei Mohilew am 12.7.1941 // Беларускі гістарычны часопіс. 2007, № 7. С. 13—19.

[7] Новікаў С. Гомельская бітва 1941 года: спробы рэканструкцыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2012, № 8. С. 3—14; Ён жа. Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі // Беларускі гістарычны часопіс. 2012, № 11. С. 14—24.

[8] План поражения // Кантор Ю.З. Война и мир Михаила Тухачевского. СПб., 2008. С. 538—575.

[9] Великая Отечественная без грифа секретности. Книга потерь. Новейшее справочное издание. С. 78.

[10] Новікаў С.Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў. 2-е выд. Смаленск, 2015. С. 99.

[11] Соображения и распоряжения фюрера от 28 июля 1941 г. // Дашичев В.И. Стратегия Гитлера — путь к катастрофе, 1933—1945: истор. очерки, док. и материалы: в 4 т. Т. 3: Банкротство наступательной стратегии в войне против СССР, 1941—1943. М., 2005. С. 294.

[12] Там жа. С. 280.

[13] Новікаў С. Магілёўская бітва 1941 года ў данясеннях вермахта // Беларускі гістарычны часопіс. 2011, № 7. С. 23—34.

[14] Оборона Беларуси летом 1941 г. // Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945 / А.А.Коваленя (рук. авт. кол-ва), А.М.Литвин, В.И.Кузьменко [и др.]. Мн., 2005; Трагическое лето 1941-го // Беларусь. 1941—1945: Подвиг. Трагедия. Память. В 2 кн. Кн. 1. Мн., 2010. С. 6—58.

[15] BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 21.6.1941 (Vortrag): RH 21-2/927, bl. 13.

[16] Объяснение генерал-майора Б.Фомина, данное в 1956 г. заместителю начальника Генерального штаба Советской Армии по военно-научной работе генералу армии В.В.Курасову // 1941 год: Страна в огне: В 2 кн. Кн. 2. Документы и материалы. С. 134-135.

[17] Там жа. С. 135.

[18] Гаврилов П.М Сражается крепость. Изд. 2-е, испр. и доп. Краснодар, 1980.

[19] Брестская крепость. Война и мир / автор концепции и текста А.Суворов. Брест, 2010. С. 209.

[20] Данясенні аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска ад 8.07.1941 // Беларускі гістарычны часопіс. 2010, № 6. С. 43.

[21] BA-MA. Darstellung der Ereignisse am 8.7.1941: RH 21-2/927, bl. 159.

[22] Исаев А.В. Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг. М., 2010. С. 334, 347.

[23] Новікаў С. Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі. С. 21.

[24] Документы штаба 172-й стрелковой дивизии Красной Армии о боях в районе Могилева. Июль 1941 г.: Оперсводка № 12 к 2.00 13.7.41. Штадив 172 // Могилевский поисковый вестник. Выпуск 10: 75-летию героической обороны г. Могилева и Днепровского рубежа посвящается. Могилев, 2015. С. 195.

[25] Бой 2-га батальёна 6-га танкавага палка пад Магілёвам // Новікаў С.Я. Адлюстраванне падзей на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г. у нямецкіх архіўных матэрыялах // Беларускі гістарычны часопіс. 2007, № 7. С. 12—19.

[26] Новікаў С.Я. Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў. 2-е выд. С. 62.

[27] Там жа. С. 99.

[28] Грицюк В. Стратэгічні та фронтові операції Великої Вітчизняної війни на теренах України // Україна ў Другій світовій війні: погдяд з XXI ст.: Історични нариси: у 2 кн. Кн. перша / Ред. кол.: В.А.Смолій (голова колегії) [і інш.]. Київ, 2010. С. 208—302.

[29] Исаев А.В. Боевые действия Юго-Западного и Южного фронтов в начале Великой Отечественной войны (22 июня — 9 июля 1941 г.). Автореф. дис...канд. ист. наук. М., 2012. С. 20, 27.

[30] 1941 год. Страна в огне: В 2 кн. Кн. 1. Очерки. С. 540.

[31] Україна ў Другій світовій війні: погдяд з XXI ст.: Історични нариси: у 2 кн. Кн. перша / Ред. кол.: В.А.Смолій (голова колегії) [і інш.].

[32] Грицюк В. Стратэгічні та фронтові операції Великої Вітчизняної війни на теренах України // Там жа. С. 208—302.

[33] Лысенко О. Історіописання Другої світової війни як самастійна субдисципліна // Там жа. С. 9.

[34] Доклад генерал-лейтенанта С.А.Калинина Военному совету Западного фронта "Некоторые выводы из опыта первых трех месяцев войны и характер ближнего боя" от 25 сентября 1941 г. // 1941 год. Страна в огне: В 2 кн. Кн. 2. Документы и материалы. С. 180—186.

[35] Новікаў С. Баявыя дзеянні Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 года ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны часопіс. 2015, № 5. С. 36—42.

[36] Arnold K.J. Die Wehrmacht und die Besatzungspolitik in den besetzten Gebieten der Sowjetunion. Kriegsführung und Radikalisierung um "Unternehmen Barbarossa". Berlin, 2005; Hürter J. Hitlers Heerführer. Die deutschen Oberbefehlshaber im Krieg gegen die Sowjetunion 1941/42. München, 2006; Pohl D. Die Herrschaft der Wehmacht. Deutsche Militärbesatzung und einheimische Bevölkerung in der Sowjetunion 1941—1944. München, 2008; Hartmann Ch. Wehrmacht im Ostkrieg. Front und militärisches Hinterland 1941/42. München, 2009.

[37] Кілічэнкаў А.А., Новікаў С.Я. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны: сучасная гістарыяграфія і крыніцазнаўства // Беларускі гістарычны часопіс. 2011, № 6. С. 17; Киличенков А.А. Заключение // Преддверие и начало Великой Отечественной войны: проблемы современной историографии и источниковедения: материалы международной научно-практической конференции. Москва, 2 апреля 2011 г. М., 2012. С. 248.